


# Берагіня фестывалю

Прыемна, што ў сучасным глабалізаваным свеце мы здольныя назіраць форум карэннай культуры, які прафесар Ніл Гілевіч ацэньвае як «гарант вялікай і шчаслівай будучыні нацыянальнага мастацтва ў свабоднай, незалежнай Беларусі». Гаворка ідзе пра Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня», на якім заўжды надзвычай разнастайна і годна прадстаўленая карэнная культура нашага народа. Праходзіць ён праз год (з 1999-га) у адмысловай па многіх параметрах мясцовасці – прыгожай і маляўнічай беларускай Рудабелцы. Рудабельская зямля (цяпер адміністрацыйная назва рэгіёну – Акцябрскі раён Гомельскай вобласці) слаўная адметнай традыцыйнай культурай, носьбіты якой – жыхары навакольных вёсак. Яе выяўленнем і стварэннем умоваў далейшага захавання займаюцца супрацоўнікі і падначаленыя мясцовага аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, які шматгадоў узначальвае Святлана Беразоўская, сапраўдная Берагіня фестывалю – таленавіты кіраўнік, тонкі псіхолаг і прыгожая жанчына, якая ў хуткім часе адсвяткуе свой 55-гадовы юбілей.



*С. Беразоўская (справа) і У. Шчасны на фестывалі «Берагіня»*

Фестываль «Берагіня», на якім заўжды разнастайна прадстаўлена музычная і танцавальная культура Беларусі, ужо ад пачатку мадэляваўся яго дырэктарам С. Беразоўскай і аўтарам канцэпцыі этнахарэолагам Міколам Козенкам як эксперыментальная пляцоўка па вывучэнні, падтрымцы і наладжванні пераемнасці ў развіцці фальклорнага мастацтва. Сёння можна адзначыць, што ўплыў фальклорнай фестывальнай дзейнасці быў спрыяльным не толькі для стану экалогіі традыцыйнага мастацтва лакальнага рэгіёну, але і для фальклорнага руху краіны цалкам.

Па выкладках аналітыкаў вынік 15-гадовага ўплыву «Берагіні» на сістэму традыцыйнай музыкі Рудабельшчыны і Беларусі цалкам акрэслівае няспынныя і станоўчыя тэндэнцыі развіцця сістэматычнай пераемнасці фальклору ў краіне. Аналіз сведчыць, што, нягледзячы на амаль няспыннае знікненне помнікаў аўтэнтычнага фальклору ва ўсёй Беларусі ўвогуле і на Рудабельшчыне ў тым ліку, на знікненне (на жаль, непазбежнае) яго сталых носьбітаў, пад уплывам фестывальнай дзейнасці штогод з'яўляецца і расце колькасць маладых пераемнікаў фальклору. Вядома, што без сістэмнай шматгадовай фестывальнай дзейнасці – гэта немагчыма. Каэфіцыент дзейснасці фестывальнага руху ў справе захавання традыцыйнай музычнай культуры Рудабельшчыны і Беларусі ўвогуле, як сцвярджае аспірантка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Юлія Кучвальская, можа разглядацца як велічыня, якая стабільна расце прыкладна на 1,8 % у год. Амаль неверагодна, што такія сур'ёзныя зрухі ў айчыннай культуры кантралюе заўжды сціплая і самаіранічная Святлана Анатольеўна, якая, фактычна, сваім рудабельскім фестывальным «ключом» адмыкае карэннаму мастацтву беларусаў шлях у трэцяе тысячагоддзе.

На сучасным этапе фестывальны рух – найбольш эфектыўная і перспектыўная форма трансляцыі фальклору ў асяроддзі маладога пакалення. Пазітыўную тэндэнцыю вельмі своечасова адзначае старшыня экспертнай групы фестывалю, этнамузыколаг Тамара Варфаламеева: «Фестываль у Рудабелцы – гэта жывы арганізм, які дынамічна развіваецца і крок за крокам уключае ў свае імпрэзы ўсё новыя і новыя віды і формы матэрыяльнай і нематэрыяльнай традыцыйнай спадчыны беларусаў і прыцягвае да сябе ўсё больш моладзі».

Дзякуючы «Берагіні» на Рудабельшчыне і ў краіне цалкам склалася сістэма правядзення мініфэстаў, аглядаў-конкурсаў, творчых эстафетаў, цыклаў краязнаўчых мерапрыемстваў, інтэрактыўных фальклорных імпрэзаў, якая садзейнічае пошуку мадэлі пераемнасці карэнных мастацкіх традыцыяў ва ўмовах XXI стагоддзя, выяўленню і самарэалізацыі новых талентаў-самародкаў сярод дзяцей, падлеткаў і моладзі Беларусі. Фестывальны фальклорны рух мяжы XX – XXI стагоддзяў, у авангардзе якога апынулася «Берагіня», стварыў перадумовы для экалагічнай раўнавагі традыцыйнай музычнай культуры краіны на пераломным і таму нестабільным моманце яе існавання.

***Паглядаючы на шматгадовую плённую і самаадданую працу дырэктара Фестывалю Святланы Беразоўскай, хочацца шчыра пажадаць напярэдадні юбілею перманентнага поспеху выключна ўсім яе пачынанням і як адміністратара, і як чалавека... Беларускай культуры і мастацтву ад гэтага толькі паспрыяе.***

*Вячаслаў КАЛАЦЭЙ,*
*загадчык кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ*



*Аўтэнтычны гурт з вёскі Гаць «Перазвоны»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ